Аксана Стрынчан

Аксана Стринчан

Кава

з украінскім мёдам

з українським медом





Аксана Спрынчан

Кава з украінскім мёдам

Паэзія

твердиня
поліграфічно видавничий дім
Луцьк - 2017

Аксана Спрынчан

Кава з українським медом

Поезія

Переклад з білоруської Миколи Мартинюка

твердиня
поліграфічно видавничий дім
Луцьк - 2017

УДК 821.161.3=161.2
ББК 84.4 БЄА
С 74

Спрынчан Аксана. Кава з украінскім мёдам : паэзія / А. В. Спрынчан ; пераклад з беларускай мовы Миколы Мартынюка. – Луцк : ПВД «Твердиня», 2017. – 212 с.

Гэта першая паэтычная кніга Аксаны Спрынчан, перакладзеная на мову ейных продкаў па мечу. У адметным сусвеце, створаным паэткай, знітоўваюцца летуценне і драматычная калізія, пачуццёвасць і інтэлектуальнасць, традыцыя і эксперымент. Асацыятыўна-філасофская паэзія аўтаркі для тых, каму каханне не замінае думаць, а думанне – кахаць. Можна нават перафразаваць: напачатку для таго, каму каханне не замінае перакладаць, а перакладанне – кахаць. У Міколы Мартынюка акурат атрымалася суладзіць украінскі сусвет перакладаў з беларускім сусветам арыгіналаў.

ISBN 978-617-517-277-3

УДК 821.161.3=161.2
ББК 84.4 БЄА
С 74

Спринчан Аксана. Кава з українським медом : поезія / А. В. Спринчан ; пер. з білорус. Миколи Мартинюка. – Луцьк : ПВД «Твердиня», 2017. – 212 с.

Це перша поетична книга Аксани Спринчан, перекладена мовою її предків по мечу. У відмінному світі, створеному поетесою, поєднуються мріяння і драматична колізія, чуттєвість та інтелектуальність, традиція і експеримент. Асоціативно-філософська поезія авторки для тих, кому кохання не заважає думати, а думання – кохати. Можна навіть перефразувати: передусім для того, кому кохання не заважає перекладати, а переклад – кохати. Миколі Мартинюку якраз вдалося узгодити український світ перекладів з білоруським світом оригіналів.

ISBN 978-617-517-277-3

цела маё стане
зямлёю
душа мая стане
небам
а пакуль я –
рыса далягляду –
колькі ні набліжайся
аддаляюся
каб застацца сабою

тіло моє стане
землею
душа моя стане
небом
а допоки я –
риска виднокола –
скільки не наближайся
віддаляюся
щоб собою залишитись

Перад захадам сонца
ты чытаеш Хайдэгера.
А я п’ю каву і гляджу
на разгорнутыя
«Час і быццё».
У перакуленых літарах
таямнічая значнасць
звычайнае рэчы,
і я чую кліч цішыні.
Але сонца хаваецца,
і ў размовах сплываюць
і час, і быццё…

При західному сонці
ти читаєш Гайдеґґера.
А я п'ю каву і дивлюся
на розгорнуті
«Час і буття».
У перекинутих літерах
значущість таємнича
речей звичайних,
і поклик тиші чую я.
Але сонце ховається,
і в розмовах спливають
і час, і буття…

Мне не бывае сумна,
ды сум бывае ад таго,
што не бывае
неба
ў небыцці.

Мені не буває сумно,
та сум буває лиш тому,
що не буває
неба
в небутті.

Створаная
з рабра
верлібра,
яблык абкусваю
райскі...

Смак свабоды
з жалезам акісленым.

Створена
з ребра
верлібру,
яблуко обкушую
райське…

Свободи смак
із залізом окисленим.

недзе ў Свіслачы
плавае рыбіна
прынесеная бацькамі
з «Акіяну»
і выпушчаная мною
малою
карп люстраны
з маім сапраўдным
адлюстраваннем
без стрававання

десь у Свіслочі
рибина плаває
принесена батьками
з «Океану»
і випущена мною
малою
короп дзеркальний
з моїм правдивим
віддзеркаленням
без травлення

– Смачна працаваць! –
зычыць дачушка,
гледзячы на рукі
ў чорным шакаладзе.
Залазіць пад пазногці
і ў зморшчынкі
смачная мара –
зямля.

– Хай смачно працюється! –
зичить донечка,
дивлячись на руки
в чорному шоколаді.
Залазить під нігті
і в зморщечки
смачна мрія –
земля.

А я чытаю камяні,
яны належалі спакою,
пакуль не ведала пра страх,
прычасце не прайшла журбою.
А я чытаю камяні –
у іх мой лёс і лёс краіны,
дзе кожны камень –
на касцях,
дзе кожны камень –
напамінам,
дзе кожны КАМЕНЬ –
як АМІНЬ,
вянец малітвы
за Айчыну…

А я читаю камені,
вони належали спокою,
докіль не знала ще про страх,
не причастилася журбою.
А я читаю камені –
у них мій хрест і хрест країни,
де кожен камінь –
на кістках,
де кожен камінь –
наче тризна,
де кожен КАМІНЬ –
як АМІНЬ,
вінець молитви
за Вітчизну…

Ластаўка

Ніхто цябе не разумее, мама…
А ты ўсё клічаш
ластаўкай мяне…
І я лятаю нізка над зямлёю,
каб дождж пайшоў
і змыў тваю знямогу.
А пёркі падаюць,
як літары, як слёзы, –
я зачапілася крылом
за гэты свет,
дзе немагчыма зразумець нікога,
ды нехта ўсё ж спрабуе зразумець…
І я лятаю нізка над зямлёю
не толькі для таго,
каб дождж прыйшоў, –
каб разуменне
да людзей прыйшло…
Я ластаўка,
пакліканая болем…

Ластівка

Ніхто тебе не розуміє, мамо…
А ти мене
все ластівкою звеш…
І я літаю низько над землею,
щоб дощ пішов
і змив твою знемогу.
Пір'їнки падають,
як літери, як сльози, –
я зачепилася крилом
за всесвіт цей,
де неможливо зрозуміть нікого,
та хтось-таки все ж прагне зрозуміти…
І я літаю низько над землею
не ради того лиш,
щоб дощ прийшов, –
щоб розуміння
до людей прийшло…
Я ластівка,
покликана болінням…

22

чорны і белы снег
такая ж на ім сарока
чутку прынесла вясновую
пра блізкае лета
кіну манетку ёй
з блізкай краіны
хай будзе шчасце
ў птушкі і Украіны

чорний і білий сніг
така ж на ньому сорока
чутку принесла весняну
про літо близеньке
кину монетку їй
з близької країни
хай буде щастя
в пташки і України

Калі я стану сухенькай бабуляй,
апранутай згодна з модаю
гадоў, якім яшчэ не час надыходзіць,
і мне давядзецца ўзяць у рукі кіёчак,
я, непапраўная філалагіня,
адчую, што мяне з маім кіем
чакае Кіеў,
п'ючы ў кавярні на Крашчаціку каву,
я апавяду сваёй спадарожніцы –
кавеньцы,
што адна з маіх дзіцячых няспраўджаных мараў –
жыць у доме з хімерамі.
І калі мы, стамлёныя, даклыпаем да яго,
і я прысяду на прыступкі,
кіеўляне і госці сталіцы зразумеюць,
як не ставала гэтаму дому
старажытнабеларускай пачвары.

25

Коли сухенькою бабунею я стану,
одягнутою за модою
років, яким не час іще настати,
і мені в руки доведеться взяти кийочок,
я, невиправна філологиня,
відчую, що мене з моїм києм
чекає Київ,
п’ючи в кав’ярні каву на Хрещатику,
я розповім своїй супутниці –
ковіньці,
що одна з моїх нездійснених дитячих мрій –
жити в будинку з химерами.
І коли ми, натомлені, доклигаєм до нього,
і я на східці присяду,
кияни і столичні гості зрозуміють,
як не вистачало цьому домові
прадавньобілоруської почвари.

П’ю каву з украінскім мёдам,
сланечнікавым,
і цябе ўяўляю
трошкі сонным,
але болей – сонечным…
І раенне думак,
знітаваных з тваімі,
кружляе,
на галінку Сусветнага Дрэва
яны разам чапляюцца.
І вось-вось пабудуюць гняздо сабе
новае, лепшае…
Джаліць зноўку мяне
пчала беларускае рэўнасці.

П'ю каву з українським медом,
соняшниковим,
і тебе уявляю
трішки сонним,
але більше – сонячним…
І роїння думок,
сплетених з твоїми,
кружляє,
на гілку Світового Дерева
вони разом чіпляються.
І ось-ось зів'ють гніздо собі
нове, ліпше…
Жалить знову мене
бджола білоруських ревнощів.

Я абіраю бульбу,
я абіраю Беларусь.
Не трэба іншага раю,
ды і пекла іншага не трэба.
Гэтак жа думаюць
каларадскія жукі.
Неўзабаве пачнецца
сезон змагання
з аднадумцамі.

29

Я обираю бульбу,
я обираю Білорусь.
Не треба іншого раю,
та й іншого пекла не треба.
Так само думають
колорадські жуки.
Невдовзі почнеться
сезон змагання
з однодумцями.

гуканне вясны
папяровыя птушкі
ірвуцца з дрэваў
нібы з аўтазакаў
нават танчаць усе
так
нібыта іх зараз
возьмуць
Дзень Волі
учора
а сёння
яе чаканне
у краіне маёй даўно
вясна
каляндарная толькі
карагодзіць амон
адбіваючы тахты
дручкамі

закликання весни
паперові пташки
з дерев ірвуться
ніби з автозаків
навіть танцюють усі
так
неначе їх от-от
заберуть
День Волі
вчора
а нині
її чекання
у країні моїй давно
весна
лише календарна
водить коло омон
відбиваючи такти
кийками

32

Ку-ку, ку-ку, ку-
ку, ку-ку, ку-ку, ку-ку,
ку-ку, ку-ку…

Недакувала зязюля
хоку.

33

Ку-ку, ку-ку, ку-
ку, ку-ку, ку-ку, ку-ку,
ку-ку, ку-ку…

Недокувала зозуля
хоку.

Думкамі пра цябе
вышываю,
як некалі бабуля
крыжыкам.

У глыбіні прыгажосці –
могілкі.

Думками про тебе
вишиваю,
як колись бабуся
хрестиком.

У глибині краси –
гробовище.

Не люблю цябе,
не кахаю,
аднак адчуваю цябе,
адчуваю
паміж небам,
квітненнем рабіны
і роднаю мовай...
У дыханні адчаю
дыханне тваё
адчуваю...

Не люблю тебе,
не кохаю,
однак відчуваю тебе,
відчуваю
поміж небом,
горобини цвітінням
і мовою рідною…
У подиху відча́ю
твій подих
відчуваю…

Так даўно
не прыходзілі словы –
дзве поўні паспелі
неба працяць тугою
і знікнуць.
Неаднойчы мне снілася –
зорка ляціць
і разбіваецца
аб чужое жаданне кахання і славы.
І я шукаю зорку сваю,
каб пахаваць
згодна звычаяў зорных
паміж словаў і сноў…
А словаў няма…

Так даўно
не прыходзілі словы,
што і сны
перасталі прыходзіць…

Так давно
слова не приходили –
дві повні поспіли
тугою небо пройняти
і щезнути.
І не раз мені снилося –
зірка летить
і розбивається
об чуже жадання кохання і слави.
Тож я зірку шукаю свою,
щоб поховати
за звичаєм зоряним
помежи слів і снів...
Але слів нема...

Так давно
слова не приходили,
що і сни
перестали приходити...

бачыла Луцк
адно пад поўняй
таму і напоўніцу можна запомніць
таму і лёгка
на патэльню ўспамінаў
выбіць хатні жаўток
кожны маладзік –
сустрэчы выток

бачила Луцьк
лише під повнею
тому і спóвна зостанеться в спомині
тому і легко
на пательню спогадів
вибити хатній жовток
кожен молодик –
то витік зустрічі

42

Шчасце маленства

У прыпяцкай траве
гуляе маё маленства,
плыве да гарлачыка,
назірае за стрэлкай.
І не ведае, што яно –
апошняе маленства
без Чарнобыля.

Щастя дитинства

У прип'ятській траві
моє дитинство грається,
пливе до латаття,
за бабкою назирає.
І не знає, що воно –
останнє дитинство
без Чорнобиля.

Я нарадзілася
ў маленькім паўднёвым мястэчку,
дзе растуць бурштынавыя абрыкосы
і вінаград колеру закаханых сініх вачэй,
дзе чырвоныя купалы вяргіняў
упрыгожваюць чырвоную царкву,
дзе грушы падаюць у жніўні, як знічкі,
а знічкі любяць не мора,
а Прыпяць, Белае возера
і глыбокія студні…
Я нарадзілася на поўдні
Беларусі…
І не існуе ў свеце такой Вясны,
якая прымусіла б вырачыся
майго лунінецкага выраю.

Я народилася
в маленькому південному містечку,
де ростуть бурштинові абрикоси
і виноград кольору закоханих синіх очей,
де червоні маківки жоржини
прихорошують червону церкву,
де груші падають у серпні, як зорі,
а зорі не море люблять,
а Прип'ять, Біле озеро
і глибокі криниці…
Я народилася на півдні
Білорусі…
І не існує в світі такої Весни,
яка б примусила зректися
мого лунинецького вирію.

дарога да лесу
але я застаюся
ў полі
твайго прыцягнення
жыта
пустазелле звіваю
ў вяночкі нябёсныя
большы
меншы
і яшчэ меншы
ствараю
гняздзечка
каб адпачыў у дарозе
лёс

дорога до лісу
але я зостаюся
в полі
твого притягання
жита
волошки сплітаю
у віночки небесні
більший
менший
і ще менший
створюю
гніздечка
щоб відпочила в дорозі
доля

48

Табе даспадобы слова «зараз»,
бо ў ім і зараза, з якою ты разам,
бо ў ім і жаданне – усё мець адразу,
бо ў ім і зара, з якое мы разам.
І нават, калі паспрабуеш
ты справа налева пайсці,
зноў апынешся ў бясконцасці «зараз»
і, паглядзеўшы ў наіўныя вочы мае,
вельмі душэўна пачнеш
мне чытаць паліндром:
«А зараз зараза...»

49

Тобі подобається слово «зараз»,
бо в ньому й зараза, з якою ти разом,
бо в ньому й бажання – все мати одразу,
бо в ньому й зоря*, з якої ми разом.
І навіть, коли зробиш спробу
ти справа наліво піти,
опинишся знов в нескінченності «зараз»
і, поглянувши в очі наївні мої,
вельми душевно почнеш
читати мені паліндром:
«А зараз зараза…»

* Білоруська «зара» справді прозирає у слові «зараз».

рогі месяца
паглынула
ягоная жаночая сутва –
поўня
поўна ню і нюансаў
ньюфаўндленд-ноч –
чорная сука –
выцягвае
слова
што патанала
ў дзённым натоўпе
раздзірае
чорную сукню –
мужчынская сутнасць поўні
паказвае рогі

роги місяця
поглинула
його жіноча сутність –
повня
повна ню і нюансів
ньюфаундленд-ніч –
чорна сука –
витягує
слово
що потопало
в денному натовпі
роздирає
чорну сукню –
чоловіче єство повні
показує роги

Калючкі твае
вышываюць на твары
КАХАЮ
крыжыкам,
гладдзю
да бязладдзя…

Твої колючки
на лиці вишивають
КОХАЮ
хрестиком,
гладдю
до безладдя…

54

Гістарычны,
дэтэктыўны,
інтэлектуальны,
любоўны,
навукова-фантастычны,
прыгодніцкі,
сатырычны,
сацыяльна-псіхалагічны,
утапічны,
філасофскі.

І ўсё гэта
пра наш з табою
раман.

55

Історичний,
детективний,
інтелектуальний,
любовний,
науково-фантастичний,
пригодницький,
сатиричний,
соціально-психологічний,
утопічний,
філософський.

І все це
про наш з тобою
роман.

На Кальварыйскіх могілках
вясна…
Лісточкі распускаюцца
і новыя крыжы…
У незямной пакутнай цішыні
нясе стары лісток
на новае гняздо
імклівы чорны стрыж…

На Кальварійськім цвинтарі
весна…
Листочки розпускаються
й нові хрести…
У неземній страждённій тиші
несе старий листочок
на гніздо нове
вертлявий чорний стриж…

То клякочуць буслы,
то вароны над намі крычаць…
Мы прыходзім у свет
і сыходзім у свет…
І на тым, і на гэтым
як буслам – клекатаць нам,
і на тым, і на гэтым
нам крычаць – як варонам…
І ў зямное цішы,
і ў цішы незямное
мы сябе пракрычым,
сябе праклякочам.
Мы прыходзім у свет
і сыходзім у свет…
І на тым, і на гэтым –
не змаўкаючы
моўкнем…

То клекочуть буслі,
то ворони над нами кричать…
Ми приходимо в світ
і відходимо в світ…
І на тому, й на цьому
клекотати буслами нам,
і на тому, й на цьому
нам кричати воронами…
Чи земна німота,
чи то тиш неземна –
ми себе прокричим,
себе проклекочем.
Ми приходимо в світ
і відходимо в світ…
І на тому, й на цьому –
не вмовкаючи
мовкнем…

Адзінота такая,
што нават у вершы
лірычнага героя няма.
Я жыву ў сусветным натоўпе
ў чарзе па смерць.
На маёй далоні
напісаны нябачны нумар
з нагэтулькі вялізарнай лічбай,
што на ёй я магу надрапаць верш.
Вось тады і з’явіцца
лірычны герой-чытач,
закаханы, шчаслівы,
па-постмадэрнісцку
пазычаны з вершаў чужых
няйнакш.

Самотина така,
що навіть у вірші
ліричного героя нема.
Я живу у всесвітньому натовпі
в черзі по смерть.
На моїй долоні
написано невидимий номер
з настільки величезним числом,
що на ньому я можу нашкрябати вірш.
Отоді і з’явиться
ліричний герой-читач,
закоханий, щасливий,
по-постмодерному
позичений з віршів чужих,
певна річ.

62

Усё жыццё можа чакаць
толькі адна жанчына –
смерць...

Хачу,
каб ты жыў.

Усе життя чекати може
одна-єдина жінка –
смерть...

Волію,
щоб ти жив.

Сонца ці месяц? –
пытаешся раптам.
А я абіраю
поўню,
якая ведае,
што такое быць месяцам,
якая верыць,
што яна ёсць сонцам.

Сонца ці сон? –
задаеш пытанне.
А я называю –
сон-траву,
якая ведае
калыханку сонца,
якая верыць
у сны на вятры…

Сонце чи місяць? –
запитуєш раптом.
А я обираю
повню,
яка знає,
що таке місяцем бути,
яка вірить,
що вона – сонце.

Сонце чи сон? –
ставиш питання.
А я називаю –
сон-траву,
яка знає
колисанку сонця,
яка вірить
у сни на вітрі…

Да яшчаркі
так пяшчотна дакранулася,
што хвост мне
не пакінула.

Думала – да (пра) цябе…

До ящірки
так ніжно доторкнулася,
що хвоста мені
не покинула.

Думала – до (про) тебе…

68

З перабітымі крыламі,
але –
лятаю.
Ведаю –
так не бывае,
але –
лятаю...
Бо не птушка –
жанчына,
што ў песню тваю
заляцела,
і на крылах яе
не каханне,
а вечнасць
сустрэла.

З крильми перебитими,
але –
літаю.
Знаю –
так не буває,
але –
літаю…
Бо не пташка –
а жінка,
що в пісню твою
залетіла,
і на крилах її
не кохання,
а вічність
зустріла.

70

У мяне ёсць нешта
ад пантэры і пумы.
У мяне ёсць нешта
ад ільва і львіцы.
У мяне ёсць нават
рысы ад рысі.
Ведала: табе
падабаюцца коткі,
але выявілася –
толькі свойскія…

У мені є дещо
від пантери і пуми.
У мені є дещо
від лева й левиці.
У мені є навіть
риси від рисі.
Знала, що тобі
подобаються кішки,
але виявилося –
тільки свійські...

Аддам цябе
святлу чужых вачэй…
Аддам святлу,
таму – не пашкадую…
Так сонца аддаюць,
зямлю і зоркі тым,
хто будзе жыць пазней,
хто не пабачыць,
як плылі аблокі,
калі вясёлка
абдымала дом твой,
а я пісала будучыні словы:
«Аддам цябе
святлу чужых вачэй…»
Пісала іх
алоўкам простым.
Выцірала…
Ды, мабыць, моцна націскала,
і светлыя чыталіся сляды:
«Аддам цябе
святлу чужых вачэй…»

Віддам тебе
вогню чужих очей…
Віддам вогню,
і геть не пошкодую…
Так сонце віддають,
і землю, й зорі тим,
хто житиме пізніш,
хто не побачить,
як плинули хмарки,
коли веселка
обняла твій дім,
а я прийдешності слова писала:
«Віддам тебе
вогню чужих очей…»
Писала їх
звичайним олівцем.
Стирала…
Та, мабуть, сильно натискала,
і світлі проявлялися сліди:
«Віддам тебе
вогню чужих очей…»

А ў тваёй руцэ –
не мая рука,
а ў маёй рацэ –
камяні на дне.
Камяні, што кідалі
мы, шчаслівыя,
а кругі ад іх
разышліся, згінулі…
У тваёй рацэ
камень,
што не тоне,
на маёй руцэ
крыжык,
каб успомніць…

А в твоїй руці –
не моя рука,
а в моїй ріці –
камені на дні.
Камені, що кидали
ми, щасливими,
кола ж на воді
розійшлися, згинули…
У твоїй ріці
камінь,
що не тоне,
на моїй руці
хрестик –
наче спомин…

На Белым возеры
ля каранёў сасны,
што цягнуцца
ў бясконцыя стагоддзі,
гляджу на кветку-матылёк –
лабелія…
Палеская краса,
а святасці ў ёй,
што боязна мне нават дакрануцца.
І раптам
белы матылёк злятае,
і з белым вершам
я за ім
(за ёй?)
імкнуся.

На Білім озері
при коренях сосни,
що тягнуться
в століття нескінченні
дивлюсь на квіточку-метелика –
лобелія…
Краса поліська,
а святості у ній,
що боязко мені вже й доторкнутись.
Аж тут
метелик білий спурхує й летить,
і з білим віршем
я за ним
(за нею?)
лину.

Майму народу

Вер мне толькі тады,
калі размаўляю
па-беларуску,
бо і сама тады
веру сабе і Табе.

На мяне спадзявайся толькі тады,
калі размаўляю
па-беларуску,
бо і сама тады
спадзяюся на сябе і Цябе.

Любі мяне толькі тады,
калі размаўляю
па-беларуску,
бо і сама тады
люблю сябе і Цябе.

Вера, Надзея, Любоў
няхай размаўляюць заўсёды
на мове светлай зямлі,
на мове святой зямлі,
на мове свету,
якім ёсць мы.

Моєму народові

Вір мені тільки тоді,
коли розмовляю
білоруською,
бо і сама тоді
вірю собі і Тобі.

Сподівайся на мене тільки тоді,
коли розмовляю
білоруською,
бо і сама тоді
сподіваюсь на себе і Тебе.

Люби мене тільки тоді,
коли розмовляю
білоруською,
бо і сама тоді
люблю себе і Тебе.

Віра, Надія, Любов
нехай розмовляють завжди
мовою світлої землі,
мовою святої землі,
мовою світу,
яким є ми.

Яны сядзелі
ў адным кабінеце.
Яна піла «Тэрафлю»,
а ён «Колдрэкс».
І ёй карцела сказаць
«Ай лаў ю»,
але жыццёвы колдрэкс-код
дазваляў толькі
«Люблю».
І сваімі асіплымі галасамі
ў моўна-хворай краіне
яны размаўлялі
на мове
прыгожай, як любоў,
і пакутлівай, нібы каханне.

Вони сиділи
удвох в кабінеті.
Вона пила «Терафлю»,
а він «Колдрекс».
І їй кортіло сказати
«Ай лав ю»,
але життєвий колдрекс-код
дозволяв лише
«Люблю».
І своїми захриплими голосами
у мовно-хворій країні
вони розмовляли
мовою
красивою, як любов,
і стражденною, ніби кохання.

82

Стала часта паліваць кветкі,
выглядаючы цябе праз вакно.

Кветкі захлынуліся ад майго чакання.

Цяпер баюся глядзець
праз краты з мёртвых сцяблін…

Стала часто поливати квіти,
виглядаючи тебе через вікно.

Квіти захлинулись од мого чекання.

Тепер боюсь дивитися
крізь ґрати з мертвих стеблин…

Разнасцежаныя дзверы царквы,
ніхто не заходзіць…
І я праязджаю міма
і толькі шапчу:
«Божа, злітуйся…»
Нібыта з малітвы, словы кіроўцы:
«Плошча Свабоды».
Дзверы адчыняюцца,
ніхто не выходзіць…

Навстіж двері у церкву,
ніхто не заходить…
І я проїжджаю їх теж
і тільки шепчу:
«Боже, зглянься…»
Неначе з молитви, слова водія:
«Площа Свободи».
Двері відчиняються,
ніхто не виходить…

Суд Божы будзе пад белымі крыламі,
а не пад снегам белым.
Ды ці задзіночыць ён нас:
тых, хто верыў,
што Плошча – прошча,
і тых,
хто над Пляцам – паяц...
І ў райскім раі,
і ў пекле пякельным
Пагоня чакае нас
ці на кані,
ці пад...

Суд Божий буде під білими крилами,
а не під снігом білим.
Та чи усамітнить він нас:
тих, хто вірив,
що Площа – проща,
і тих,
хто над Плацом – паяц…
І в райському раї,
і в пеклі пекельному
Погоня чекає нас
чи на коні,
чи під…

Недзе там, дзе не трэба мне
ані чаркі, ні шкваркі,
будзе лётаць мая душа
вольнай чайкай.

Недзе тут, дзе не трэба мне
нават дня несвабоды,
я параненым птахам лячу,
ды не вылекую народа.

Ён збірае кроплі крыві
і маўкліва трымае ў роце.
Ці то перліны выйдуць з іх,
ці крыкліўцы ля эшафота.

Ці на нітку наніжуць сябе,
ці ў натоўпе затопчуць слабога.
Ані Плошчы, ні прошчы ў душы…
Беларусь – як дарога да Бога.

Десь аж там, де зайві мені
і шкварка, і чарка,
в небо злине душа моя –
вільна чайка.

Десь отут, де не треба мені
навіть дня несвободи,
я пораненим птахом лечу,
та не вилікую народу.

Краплі крові збирає він
і мовчазно тримає в роті.
Чи то перли зродяться з них,
чи зіпаки при ешафоті.

Чи на нитку нанижуть себе,
чи в юрмиську затопчуть слабого.
Ані Площі, ні прощі в душі…
Білорусь – як дорога до Бога.

Сонца – бясконца,
дзень – цень,
ночы – вочы,
глеба – неба,
трывога – дарога,
людзей – надзей,
воля – доля,
чалавек – век,
краіна – сына…

У найбанальнейшых рыфмах –
глыбокі верлібр жыцця.

Сонце – віконце,
день – пісень,
ночі – очі,
треба – неба,
тривога – дорога,
людей – ідей,
воля – доля,
чоловік – вік,
країна – сина…

У найбанальніших римах –
глибокий верлібр життя.

92

Шукаю сутву быцця
і сутву нябыту шукаю…
Каюся,
і грашу…
Ды не каюся,
а хаваюся
ў пошуках,
пошуме,
полымі
іншай душы…
Як між быццём і нябытам
сутву сваю знайсці?
Як не пакінуць раны
на небе і на зямлі?..
Бо як да сутвы набліжуся –
у вырай нехта ляціць…

Шукаю сутність буття
і сутність небуття шукаю…
Каюся,
і грішу…
Та не каюся,
а ховаюся
в пошуках,
пошумі,
полум'ї
іншої душі…
Як між буттям і небуттям
сутність свою знайти?
Як не лишити рани
як на небі, так і на землі?..
Бо як до сутності наближуся –
хтось у вирій летить…

Пад дубам камень,
быццам надмагілле…
На ім ні слова,
толькі жалуды
ляжаць сузор'ем
літары апошняй…
Магчыма, я…
З нябыту выйшла я,
каб напісаць
на камені
пад дубам
на белым аркушы –
не страшна паміраць
там, дзе жывуць
дубы і камяні…
Там мудрасць,
па якую ходзяць людзі.

Під дубом камінь,
ніби надмогильний…
На ньому ані слова,
тільки жолуді
лежать сузір'ям
літери-фіналу…
Можливо, я…
Я вийшла з небуття,
щоб написать
на камені
під дубом
на білім аркуші –
не страшно помирать
там, де живе
каміння і дуби…
Там мудрість,
по яку приходять люди.

Пакладзіце мяне ў труну
на вышытым прабабкай
прасцірадле.
Гэта ейнымі рукамі
створаныя ружы,
якія мяне не будуць калоць,
а водар іх пераможа
пах смерці.
І крыж заменяць па мне
з крывёю праколатых пальцаў
крыжыкі.

Покладіть мене у труну
на вишитім прабабкою
простирадлі.
Це її руками
створено ружі,
які не будуть мене колоти,
а пахощі їхні здолають
дух смерті.
І хрест замінять по мені
з кров'ю проколотих пальців
хрестики.

98

З’ехаць бы
ў найдзічэйшы куток Беларусі,
дзе не ступала нага чалавека.

Але, калі такі ёсць,
няхай застанецца…

І так засмечаны свет
слядамі самоты…

Податися б
у найдикіший куток Білорусі,
де не ступала людська нога.

Але, якщо такий є,
нехай залишиться…

І так засмічений світ
слідами самотності…

Спаліла твае лісты…
Доўга не ведала,
што рабіць з попелам…
Пакінула
як попельны гадзіннік.
Ён паказвае мінулае,
у якім было
чаму гарэць.

Спалила твої листи…
Довго не знала,
що робити з попелом…
Залишила
як попільний годинник.
Він показує минуле,
в якому було
чому горіти.

Я крэслю
крыжыкі ля вершаў –
сваіх паэтаў
вышываю
і разам з імі –
выжываю.

Я креслю
хрестики при віршах –
своїх поетів
вишиваю
і разом з ними –
виживаю.

Вецер шалее ў маіх валасах,
і я ўжо не я, а Медуза Гаргона.
Людзі не глядзяць на мяне,
разбягаюцца па хатах
(відаць, што чыталі
міфы Старажытнай Грэцыі).
Ніхто не хоча пабачыць
нараджэнне Пегаса –
сцяўшы мне галаву.
Можа, вось гэты?..
Ды не…
Адным камянём
стала болей
у Беларусі…

Вітер шаліє у косах моїх,
і я вже не я, а – Медуза Горгона.
Люди не глянуть на мене,
по хатах розбігаються
(напевно, читали
міфи Стародавньої Греції).
Ніхто не хоче побачити
народження Пегаса –
голову стявши мені.
Може, оцей?..
Та ні…
Одним каменем
стало більше
у Білорусі…

Э-дыпціх

1

На пасцельнай бялізне
ў пастэльных тонах
з японскімі іерогліфамі
ты ляжыш,
нібыта сярэдні радок
хоку,
а я,
карацейшая на два склады,
спрабую быць
ці першым,
ці апошнім,
пакуль не паглынае
сярэдзіна...

Е-диптих

1

На постільній білизні
в пастельних тонах
з японськими ієрогліфами
ти лежиш,
неначе середній рядок
хоку,
а я,
коротша аж на два склади,
стараюсь бути
чи першим,
чи останнім,
допоки не поглине
середина...

2

На бялізне
ў егіпецкім стылі
я –
твая Неферціці –
працягваю табе
муміё,
чорнае,
нібы літары вершаў,
гаючае,
нібы сэнс,
мумі-
я,
я,
быццам мумія,
ляжу колькі хвілінаў,
а падаецца –
тысячагоддзі...

Невыносная гульня,
хутчэй забірай мяне
з мёртвага Егіпту
ў беларускую жарсць...

2

На білизні
в єгипетськім стилі
я –
твоя Нефертіті –
простягаю тобі
муміє,
чорне,
ніби літери віршів,
цілюще,
ніби сенс,
мумі-
я,
я,
наче мумія,
лежу кілька хвилин,
а видається –
тисячоліття…

Нестерпна забава,
хутчіш забирай мене
з мертвого Єгипту
в білоруську пристрасть…

са сланечніка валынскага
зярнятка
працягну куранятку
жоўта-мядоваму
хай нясе залатыя яйкі
іх каханым
прыносяць у ложак
зранку
а потым гарбата
з сонечным мёдам
ёдам
на целе надпіс
кахаю
зьнікае
зьнікаеш
зьнікаю

із соняшника волинського
зернятко
простягну я курчатку
жовто-медовому
хай несе золоті яєчка
їх коханим
приносять у ліжко
зранку
а потім і чай
із сонячним медом
йодом
на тілі напис
кохаю
зникає
зникаєш
зникаю

Я сёння з Караткевічам начую…
І ноч кароткая,
і пакарання мне няма…
У кнізе,
быццам на кары бярозавай,
у чорных рысках –
глыбіня святла…

Я заўтра з Караткевічам начую.

Я нині з Короткевичем ночую…
І ніч коротка,
й покарань нема мені…
У книжці,
ніби на корі березовій,
у чорних рисках –
світла глибина…

Я завтра з Короткевичем ночую.

Успамінаю цябе,
а ўспамінаецца верш,
вера твая ў мяне,
вярба над вадой замерзлаю...
Успамінаю верш,
а ўспамінаешся ты,
вера мая ў цябе,
галінка, зламаная ў Вербніцу.

Силкуюсь згадати тебе,
а на пам’ять спадає вірш,
віра в мене твоя,
верба над водою замерзлою…
Силкуюсь згадати вірш,
а на пам’ять спадаєш ти,
віра в тебе моя
і гілка, відламана в Вербницю.

Шэрай зязюляй
накуваю табе гадоў.
Жаўруком заспяваю –
пабачыш неба.
Ластаўкай буду лятаць над зямлёй –
папярэджваць няшчасці.
Мудрай савою
пакажу празрыстыя дні начэй.
Чырвонай грудкай гіля
на снезе белым
нагадаю пра мінулае Радзімы.
Белым буслом і чорным
падзялю жыццё на палосы.

Толькі птушкаю шчасця
стаць табе
не змагу.

Зозулею сірою
накую тобі сотню літ.
Жайвором заспіваю –
побачиш небо.
Літатиму ластівкою при землі,
щоб відвертати нещастя.
Совою мудрою
покажу прозористі дні ночей.
Снігуром жарогрудим
на білім снігу
нагадаю про минуле Вітчизни.
Буслом білим і чорним
на смуги життя поділю.

Тільки пташкою щастя
стати тобі
не зумію.

Імя* маё
ў сабе хавае,
што чужаніца я
і госця.
Я з тых часоў,
дзе ўсе жывыя.
Я ў часе тым,
дзе шмат паўмёртвых.
Мне б дзесьці стаць
зусім сваёю,
камусьці стаць
зусім не госцяй…
Ды мне не дадзена спакою,
а толькі шлях
шляхотна-крохкі
і зрэдку дзіўныя імгненні,
як падалася
не чужою…

* *Ксенія (грэц.)* – іншаземка, чужаніца, госця.

119

Ім'я* моє
в собі ховає,
мовляв, чужинка я
і гостя.
Я з тих часів,
де всі живі ще.
Я в часі тім,
де напівмертві.
Мені б десь стати
геть своєю,
комусь не гостею,
звичайно ж...
Та супокій мені не дано,
а тільки шлях
шляхетно-рухлий
і зрідка миті дивовижні,
коли здалася
не чужою...

* *Ксенія (грецьк.)* – іноземка, чужинка, гостя.

Віно ўраджаю 1973-га года...
Які век у яго будзе
ў дзень маёй смерці?
Ужо не 25, як Максіму Багдановічу,
і не 32, як Уладзіміру Жылку.
Але яшчэ, імаверна,
53, як Уладзіміру Караткевічу,
75, як Уладзіміру Дубоўку...
А магчыма, яно яшчэ забярэ
вольны ад смерці адмежак.
Ды нават калі яму пяройдзе за сотню,
не пашкадуйце ўзяць тры чаркі.
Толькі не забудзьцеся –
белае – чырвонае – белае.

Вино врожаю 1973 року…
Який вік у нього буде
в день моєї смерті?
Уже не 25, як Максимові Богдановичу,
і не 32, як Володимирові Жилці.
Але ще, ймовірно,
53, як Володимирові Короткевичу,
75, як Володимирові Дубовці…
А можливо, воно ще забере
вільний од смерті відтинок.
Та навіть якщо йому перейде за сотню,
не пошкодуйте взяти три чарки.
Тільки не забудьте –
біле – червоне – біле.

Уся гісторыя мастацтва –
ад наскальных малюнкаў
да постмадэрнізму –
у змене аблокаў
на празрыста-блакітным
палатне неба.

Сённяшняе неба –
неба імпрэсіянізму.

123

Уся історія мистецтва –
від наскельних малюнків
до постмодернізму –
у зміні хмар
на прозористо-блакитному
полотні неба.

Нинішнє небо –
небо імпресіонізму.

Арсеню Лісу

Перадавайце ад мяне
пчолам сваім прывітанне
і соты радок гэтага года,
напоўнены любоўю,
якое стала б
на соты верш,
калі не ведаць,
як цяжка будзе пчолам
перанесці ягоны нектар у борць,
а ім жа яшчэ трэба
перадаваць з пакалення ў пакаленне
аповеды пра Вашых продкаў
і перажываць, пакідаючы ў мёдзе горыч,
што ў Вашых вачах
мала хто прачытае
сто тамоў вусна-пчалінай творчасці,
а Вы не паспяваеце занатаваць тыя паданні,
збіраючы нектар
на спаконвечных дзірванах Беларусі.

Арсеню Лісу

Передавайте од мене
бджолам своїм привітання
і сотий рядок цього року,
любов'ю наповнений,
якої стало б
на сотий вірш,
коли не знати,
як тяжко буде бджолам
перенести нектар їхній у борть,
а їм же ще треба
передавати з покоління в покоління
розповіді про Ваших предків
і переживати, залишаючи в меду гіркоту,
що в Ваших очах
мало хто прочитає
сто томів усно-бджолиної творчості,
а Ви не встигаєте занотувати ті перекази,
збираючи нектар
на споконвічних морогах Білорусі.

У жніўні
на белых падваконнях
разам з памідорамі
выспявае
беларускасць…

У серпні
на білих підвіконнях
вкупі з помідорами
доспіває
білоруськість…

128

Сканаць у жніўні,
каб замкнулася кола
і было ЯШЧЭ цёпла
сядзець ля вогнішча
і спяваць песні,
і ЯШЧЭ цёпла было
развейвацца попелу,
і цёпла было ЯШЧЭ
ўзгадваць Папялушку,
што была насамрэч
беларускай
і налівала ў крышталёвыя чаравічкі
ЯШЧЭ болей празрысты выраб
бровара «Крышталь»,
і ніхто не блытаўся,
перастаўляючы словы:
і ЯШЧЭ было цёпла,
і цёпла ЯШЧЭ было,
і было цёпла ЯШЧЭ…

Сконати в серпні,
щоб коло замкнулось
і було ЩЕ тепло
сидіти коло вогнища
і співати пісень,
і ЩЕ тепло було
розсіюватися попелу,
і тепло було ЩЕ
згадувати Попелюшку,
що насправді була
білорускою
і наливала в кришталеві черевички
ЩЕ прозоріший виріб
броваря «Кришталь»,
і ніхто не плутався,
переставляючи слова:
і ЩЕ було тепло,
і тепло ЩЕ було,
і було тепло ЩЕ…

Любоў і Сафія,
Святлана й Надзея –
прабабкі й бабулі мае.
Я іх не магла заспець маладымі,
яны – пасталелай мяне.
Любоў мяне мудрасці змалку вучыла,
Надзея – прыносіць святло.
Сафія казала:
«Не жыць без надзеі».
Святлана:
«Любоў ёсць усё».
І кожная з іх
мяне верай ахоўвае
ў людзей і жыццё.
І кожная з іх
ува мне адзінотай
і пошукам долі сваёй,
і пошукам долі маёй.

Любов і Софія,
Світлана й Надія –
прабабки й бабусі мої.
Не встигла застати я їх молодими,
вони – повнолітню мене.
Любов мене мудрості змалечку вчила,
Надія – приносить ясу.
Софія казала:
«Не жить без надії».
Світлана:
«Любов – це усе».
І кожна із них
мене вірою повнить
в людей і життя.
І кожна із них
самотою в мені
і пошуком долі своєї,
і пошуком долі моєї.

Твая :) усмешка
ў кропельках дажджу,
мая –
схаваная пад парасонам.
Мы
жоўтаму ўсміхаемся лісту,
і ён ляціць,
адрынуўшы тугу,
халодны вецер,
прадчуванне смерці…
Яго :) усмешка
ў кропельках дажджу,
яе –
хаваю я
пад парасонам…

Твоя :) усмішка
в краплях дощових,
моя –
прихована під парасолем.
Ми
жовтому всміхаємось листку,
і він летить,
відкинувши журбу,
холодний вітер,
прочування смерті…
Його :) усмішка
в краплях дощових,
її –
ховаю я
під парасолем…

чмелю мой ясны!
ці смакуе табе
на стакротках у вазе
я іх цалавала
ўжо тыдзень таму і яснела
чмелю мой светлы!
што шукаеш ты ў кветках
якімі ўпрыгожваю
і без гэтага прыгожы
свет

джмелю мій ясний!
чи смакує тобі
на стократках у вазі
я їх цілувала
вже тиждень тому і ясніла
джмелю мій світлий!
що шукаєш у квітах
якими прикрашую
і без того прекрасний
світ

Знічка

Зорка ляціць на зямлю,
і ніхто не думае,
ад чаго яна памерла –
ад старасці,
ад нейкай зорнай хваробы,
скончыла жыццё самагубствам
праз нешчаслівае каханне,
ці была атручаная
нябесным Сальеры.
Зорка ляціць на зямлю,
і ніхто не думае,
ад чаго яна памерла.

Усе загадваюць жаданні.

Летюча зірка

Зірка на землю летить,
і ніхто не зважає,
від чого вона померла –
од старості,
од якої хвороби зоряної,
чи, може, вона самогубця
через нещасне кохання,
чи її отруїв
небесний Сальєрі.
Зірка на землю летить,
і ніхто не зважає,
від чого вона померла.

Усі загадують бажання.

138

Ноч... Поўня...
Заходжу
ў чорную бездань ценю
самотнага дуба на полі.
А цень ад маёй адзіноты
яшчэ чарнейшы.
Вецер гоніць яго да краю –
раю травы,
не зялёнай,
але вальнейшай ад цемры.
Зрываюся... Зрываю
травінку святла...
Ноч... Дзве поўні маіх вачэй
з нябеснай
ствараюць трыкутнік,
востракутовы,
вострапакутны...
Заўтра не будзе поўні –
помні
пра смерць.
Жолуд падае клічнікам,
кліча яго зямля
да жыцця...
Дажыць бы,
калі цень ад яго
стане большы, чым мой,
і ўспомніць, як падаў,
і помніць пра смерць,
і яе перажыць...
І помніць ужо
пра жыццё...

Ніч… Повня…
Заходжу
в чорну безодню тіні
одинокого дуба на полі.
А тінь самотини моєї
іще чорніша.
Вітер гонить її до краю –
раю трави,
не зеленої,
але вільнішої від темряви.
Зриваюся… Зриваю
билинку світла…
Ніч… Дві повні моїх очей
з небесною
творять трикутник,
гострокутний,
гостропокутний…
Завтра не буде повні –
пам'ятай
про смерть.
Жолудь знаком оклику падає,
кличе його земля
до життя…
Дожити б,
коли тінь від нього
стане більшою, ніж моя,
і пригадати, як падав,
і пам'ятати про смерть,
і її пережити…
І пам'ятати уже
про життя…

Сведкі

Паміраюць грушы,
старыя
яшчэ ў маім маленстве.
Смалянкі, у смалянiстай мякаці якіх
нараджаліся бурштынавыя зернейкі,
чырвоныя, што здзіўлялі
сваім колерам,
гнілкі, якія вучылі знаходзіць
залатую сярэдзіну.

Паміраюць
сведкі майго маленства...
І неўзабаве сама не паверу,
што маленства было.

Свідки

Помирають груші,
старі
в моїм ще дитинстві.
Смолянки, у смолянистім м’якуші яких
народжувались бурштинові зернятка,
червоні, що дивували
своїм кольором,
гнилички, які вчили знаходити
золоту середину.

Помирають
свідки мого дитинства…
І незабаром сама не повірю,
що дитинство було.

Паміж камянямі
маёй Беларусі
ды іхнай адсутнасцю
на маёй Лунінеччыне
пераціраюць мяне
жорны жыцця,
балюча і прыгожа.
І толькі граніт,
цэлы кар'ер,
нібыта Гулівер,
зблытаны карузлікамі, –
прыжыццёвы помнік
мне і майму Палессю.

Поміж камінням
моєї Білорусі
та його відсутністю
на моїй Лунинеччині
перетирають мене
жорна життя,
болюче і красиво.
І тільки граніт,
цілий кар’єр,
неначе Гуллівер,
обплутаний карликами, –
прижиттєвий пам’ятник
мені й моєму Поліссю.

Мне трыццаць тры. Я ўкрыжавана
светам,
які і сам укрыжаваны мною...
Так ціха ў восень адыходзіць лета,
як у нябыт мае гады сыходзяць...
Быць ці не быць?
Я абіраю Быць!
І дзівіцца з мяне чужая знічка.
Той свет, якім укрыжавана, нібы спіць,
і котка скідвае на дол вялікі цвік,
нібыта цвеліць
будучага Юду.

Вже тридцять три. Я розіп’ята світом,
який так само розіп’ятий мною…
Так тихо в осінь відпливає літо,
як в небуття мої літа відходять…
Будь чи не будь?
Звичайно, «будь» – мені!
Дивується чужа летюча зірка.
Той світ, що розіп’яв мене, – немов у сні,
скидає кішка долу враз великий цвях,
мов спокушає
явленого Юду.

Туман увосень з водарам вясны…
Чаму б далей не жыць на свеце белым?..
Ды паміраюць у сяброў бацькі,
пад гэтым небам больш сябры не дзеці…
Баюся ім у вочы зазірнуць,
пабачыць тое, што мяне чакае…
Сябры – не дзеці,
я ж – яшчэ дзіця,
хоць і ў тумане тлумнага пытання:
«Чаму б не жыць?..»
У водары вясны
гусцей туга апошняга туману…
. . . .
Я запрашу гасцей…

Туман осінній в пахощах весни…
Чому б не жити ще на світі білім?..
Але батьки у друзів помирають,
не діти друзі вже під небом цим…
Боюся їм у вічі зазирнуть,
уздріти те, що і мене чекає…
Вони – не діти,
я ж – іще дитя,
хоч і в тумані безуму питання:
«Чому б не жити?..»
В пахощах весни
останнього туману сум густіший…
. . . .
Я запрошу гостей…

148

Лісце лаўлю
ў паветры –
вершы.
А тое,
што зямлі
кранулася –
проза…

149

Листя ловлю
в повітрі –
вірші.
А те,
що землі
торкнулося –
проза…

Пе|рабі‖раю жу◊равіны,
Ніˀˀˀбыта ім˒˒гненні жарˇсці.
Адк◊◊лад|аю
гол◊кі аˆголˇенасці
і тˀраві~~цы ат||руту,
і ліс\цінкі-прас/цінкі.
Мала◊досць,
яˇна – жˆ|ура|віна‖вая.
А ў сˇусе◊дзяў –
з “к˒люк|ою”
“клюˀˀква”.

Пере|би‖раю жу◊равлину,
Неˀˀˀмовбито митˈˈті пристраᵛсті.
Відк◊◊лад|аю
гол◊ки оᶺголᵛеності
і тˀравин~~ки от||рути,
і лис\точки-пла/точки.
Моло◊дість,
воᵛна – жᶺ|ура|влин‖на.
А в сᵛусі◊дів –
з «кˈлюк|ою»
«клюˀˀква».

Бабіна лета

восень
нібыта ліс
сонечнымі лапамі
спрабуе ўпаляваць
лета
а калі лета схопленае
яго прысабечвае
невядомая баба
ды што з таго беларусу –
баба дык баба
абы цёплая

Бабине літо

осінь
неначе лис
сонячними лапами
намагається вполювати
літо
а коли літо схоплене
його присвоює
невідома баба
та білорусові байдуже –
баба то й баба
аби тепла

Пяць, сем і зноў пяць...
Хоку-паэма Лысай Гары

1.1
Муха на шыбе
звініць восеньскім сумам.
Чуецца хоку.

1.2
Жоўтае лісце
ў сажалцы замест жабак.
Вецер крумкае.

1.3
Цень ад матылька
на цэлыя тры радкі.
Хоку чытаю.

1.4
Зязюля села
ў рукі старой. Год таму
ейны муж сканаў...

1.5
Пара ад кавы
ўздымаецца ў нябёсы;
хмарка цямнее.

П’ять, сім і знов п’ять...
Хоку-поема Лисої Гори

1.1
Муха на шибці
дзвенить осіннім сумом.
Чується хоку.

1.2
Жовтаве листя
в копанці замість жабок.
Вітер кумкає.

1.3
Тінь метелика
аж на цілих три рядки.
Хоку читаю.

1.4
Зозуля сіла
в руки старої. Торік
чоловік помер...

1.5
Пара од кави
в небеса здіймається;
хмарка темніє.

2.1
Сноп жыта стаіць
у хаце. Прыгадала
«Жняю» Купалы.

2.2
Гушчу ад кавы
з цукрам вожык каштуе.
Смачнага лёсу!

2.3
На хрызантэмах
жоўтае лісце вішні
вось-вось узляціць.

2.4
Яшчарка ў цэбры
плавае. Прыгледзела-
ся – нежывая.

2.5
Птушка прысела
на дрэва. Апошні ліст
распрастаў крылы.

2.1
Сніп жита стоїть
у хаті. Пригадала
«Жницю» Купали.

2.2
Гущу од кави
з цукром їжак куштує.
Смачної долі!

2.3
На хризантемах
жовтаве листя вишні
ось-ось полетить.

2.4
Ящірка в цебрі
плаває. Придивила-
ся – бездиханна.

2.5
Пташка присіла
на гілку. Останній лист
розпростав крила.



2.6
Працягвае мне
далоні свае восень,
халодны поціск.

2.7
Жоўты ліст кладу
ў пажаўцелую кнігу.
Безназоўнае…

3.1
У ракавінцы
попел ад цыгарэтаў;
высахла мора.

3.2
Вясёлка ў небе
па-восеньску прыгожым.
Мёрзлыя астры.

3.3
Жоўтая восень.
Елкі пазелянелі.
З зайздрасцю вечнай.

2.6
Простягає вже
мені долоні осінь,
холодний потиск.

2.7
Жовтий лист кладу
у пожовтілу книгу.
Безіменне все…

3.1
У черепашці
лиш цигарковий попіл;
висохло море.

3.2
Веселка в небі
по-осінньому гарнім.
Примерзлі айстри.

3.3
Золота осінь.
Сосни позеленіли.
В заздрощах вічних.

3.4
У кастрычніку
дождж цыганскі, як летам;
змывае шэрань.

3.5
Пяць, сем і зноў пяць…
Над Лысай Гарой свецiць
сузор'е Хоку.

3.4
У жовтні завжди
дощ циганський, як влітку;
змиває іній.

3.5
П’ять, сім і знов п’ять…
Над Лису Гору світить
сузір’я Хоку.

162

Чакаю не цябе.
Але ты, угледзеўшы,
бяжыш напрасткі, абдымаеш,
рады нечаканай сустрэчы:
– Ты такая рамантычная,
ты не можаш не напісаць,
як я бег да цябе праз сумёты.
Смяюся, што гэта будзе
хоку з глыбокімі слядамі.
Развітваемся,
разыходзімся ў розныя бакі.
Вяртаюся,
каб чакаць не цябе.
У чаканні
пералічваю твае сляды –
сямнаццаць…

Чекаю не тебе.
Але ти, угледівши,
біжиш навпростець, обіймаєш,
радіючи несподіваній зустрічі:
– Ти така романтична,
ти не можеш не написати,
як я біг крізь замети до тебе.
Сміюся, що це буде
хоку з глибокими слідами.
Прощаємося,
розходимось у різні боки.
Вертаюся,
щоб не тебе чекати.
У чеканні
перелічую твої сліди –
сімнадцять...

Чорнай коткаю
перабягаю табе дарогу.
Ты не абыходзіш,
не жагнаешся
і нават не трымаешся за гузік...
Чарнею ад тваёй смеласці...
«Чорным квадратам» Малевіча
гляджу на цябе,
а ты нічога ў ім не бачыш.
Вар’яцею ў сваёй глыбіні...
Чорнай зямлёю
баюся стаць для цябе –
ператвараюся
ў чорную дзірку.
Урэшце заўважаеш:
мяне няма...

Чорною кішкою
перебігаю тобі дорогу.
Ти не оминаєш,
не хрестишся
і навіть не тримаєшся за ґудзик…
Чорнію від твоєї сміливості…
«Чорним квадратом» Малевича
на тебе дивлюсь,
а ти нічого в ньому не бачиш.
Шаленію у своїй глибині…
Чорною землею
боюся стати для тебе –
обертаюся
на чорну діру.
Урешті помічаєш:
мене нема…

Да шыбы
прыціскаю вусны,
вусціш…
Над шыбеніцай
ціш, завея,
вейкі
дрыжаць,
г
а
й
д
а
е
ц
ц
а
в а,
я к
р ў
о
роўна
палова на восьмую,
сяку пятлю,
вісіць пачатак С-лова,
аснова
майго жыцця.

До шибки
губи притискаю,
стихає…
Над шибеницею
тиш, завія,
вії
дрижать,
г
о
й
д
а
є
т
ь
с
я
м а,
о к
т з
у
рівно
пів на восьму,
січу зашморг,
висить початок С-лова,
основа
мого життя.

Мы размаўлялі пра жыццё і смерць,
а ты мне прапануеш –
пра надвор’е…
Ну, добра… Зранку выпаў снег,
і вось ён памірае адвячоркам.
Ад мінуса да цёплага крыжа…
І ты не хочаш пра надвор’е слухаць.
І мы маўчым, нібы без слоў канаем,
і думаем пра смерць,
як пра жыццё…

Ми розмовляли про життя і смерть,
мені ж ти пропонуєш –
про погоду…
Ну, добре… Зранку випав сніг,
і ось він помирає в надвечір’я.
Од мінуса до теплого хреста…
І ти не хочеш про погоду чути.
Й ми мовчимо, немов без слів конаєм,
і думаєм про смерть,
як про життя…

Чакала снегу і лістоў…
Снег выпаў з чорнымі слядамі,
ліст не прыйшоў…
Туга забытага нябыту
апанавала,
нагбом піла маё жыццё,
пакуль сляды не расчытала –
там, дзе няма, – там ёсць усё,
чаго твая душа чакала,
што не адбудзецца ніколі
таму, што з кімсьці ўжо было.
Быццю ж не трэба паўтарэнняў,
хай паўтарае небыццё…

Чекала снігу і листів…
Сніг випав з чорними слідами,
листи ж без слів…
Забута нéбуть сумовито
опанувала,
хильцем пила життя моє,
докіль слідів не прочитала –
там, де нема, – усе там є,
чого твоя душа чекала,
що не відбудеться ніколи
тому, що з кимсь уже було.
Буттю ж повторення не треба,
хай повторяє небуття…

172

> Прыйдзіце да касцёла Анны,
> Там знікне горач цяжкіх дум.
>
> *М. Багдановіч*

Стома маёй душы
не любіць сядзець на месцы,
прагнецца ёй уцячы
ў блізкія гарады.
Калі квітнеюць каштаны,
імкнецца ў Сафію Кіеўскую.
Калі на сэрцы рана,
шлях ёй да Ганны ў Вільню.
Кліча каханне першае
пад купалы Масквы.
Але, калі цяжка зусім,
ратуюць Нямігі званы.

Приходьте до костелу Анни,
Там зникне гіркість дум важких.
М. Богданович

Душі моєї втома
не любить сидіти на місці,
хочеться їй утекти
в близькі міста.
Коли каштани квітнуть,
прагне в Софію Київську.
Коли на серці рана,
їй шлях до Анни у Вільню.
Кохання перше кличе
під бані Москви.
Але, як зовсім тяжко, –
рятують дзвони Немиги.

Менску

Калі я ападу ў знямозе
на шэры снег тваёй тугі,
не пераблытай –
не сняжынка –
а бежанка крывавай бітвы,
адкуль вядзе свае гады
мой горад
вечна малады,
бо вечна ён пасляваенны…
Ты – не ваяр,
і зразумела,
што не трываеш чырвань снегу.
Заплюшчы вочы…
Я растану,
як толькі памяць адпачне
на берагах тае Нямігі,
дзе кроў ніхто шчэ не ліе.

Мінську

Коли я упаду в знемозі
на сірий сніг твого жалю,
не переплутай –
не сніжинка –
а битв кривавих утікачка,
звідкіль веде свої літа
це місто
вічно молоде,
бо споконвіку повоєнне...
Не воїн ти,
і зрозуміло,
що червінь снігу не відтерпиш.
Заплющуй очі...
Я розтану,
як тільки пам'ять одпочине
на берегах Немиги тої,
де крові ще ніхто не ллє.

З царквы выходжу
ў белую завею…
Сняжынкі – як працяг
малітвы светлай,
а людзі ў чорным,
чорным,
чорным,
чорным,
як літары, што выпалі з нябёсаў
і на зямлі не могуць затрымацца,
не могуць
у руку, што працягнула,
не грошы,
а далонь сваю пакласці.
І падаюць з маёй рукі паперкі,
і нехта ловіць
іх яшчэ ў паветры…
Удзячны Богу,
вып'е ён гарэлкі,
руку працягне
з чаркай да кагосьці
і, можа, скажа тост:
«За разуменне»…

Виходджу з церкви
в білу хуртовину…
Сніжинки – наче
сонячна молитва,
а люди в чорнім,
чорнім,
чорнім,
чорнім,
як літери, що випали з небес
і на землі затриматись не можуть,
не можуть
у простягнуту їм руку
не гроші,
а свою долоню вкласти.
І папірці летять з руки моєї,
і хтось їх ловить,
ловить у повітрі…
Удячний Богу,
вип'є він горілки,
простягне руку
з чаркою до когось
і, може, скаже тост:
«За розуміння»…

Менавіта з Вамі
мне было
пабачыцца ў Вільні
ў часы Вялікага Княства Літоўскага.

Як маглі Вы спазніцца
на гэтулькі стагоддзяў
і сустрэцца са мною
на вуліцах іншай сталіцы?..

Саме з Вами
мені годилося
побачитись у Вільні
у часи Великого Князівства Литовського.

Як могли Ви спізнитися
на стільки століть
і зустрітися зі мною
на вулицях іншої столиці?..

На валасах маіх сняжынка,
а ў Вільні дождж…
І ты блукаеш з ім, самотны,
гарэлку п’еш,
чытаеш вершы вузкім вулкам
і храму з хмар,
і прад вачыма слёзы Ганны –
нібыта лёс наш…
А ў валасах маіх сняжынка
не растае,
я тут, у Менску,
пакуль без Вільні,
і без дажджу,
і без цябе…
Ды хоць і зімна мне –
чамусьці верыцца,
што пойдзе дождж,
прыедзеш ты
і Вільня вернецца…
што з намі Бог…

На голові моїй сніжинка,
а в Вільні дощ…
І ти блукаєш з ним, самотній,
горілку п’єш,
віршуєш вуличкам вузеньким
і храму з хмар,
і Ганни сльози перед очі –
мов жереб наш…
На голові моїй сніжинка
не розтає,
я тут, у Мінську,
іще без Вільні,
нема дощу
й тебе…
Надворі холодно,
та віра теплиться,
що піде дощ,
приїдеш ти
і Вільня вернеться…
що з нами Бог…

Скрыжаванне са снежнем –
белым крыжам і чорным.
Скрыжаванне з самотай –
светлым крыжам і цёмным.
Скрыжаванне з Радзімай –
вечным крыжам і буднім.
Скрыжаванне з сабою –
белым крыжам і чорным,
светлым крыжам і цёмным,
вечным крыжам і буднім.
І зноўку ратуюць
Каляды…

Середохрестя з груднем –
білим хрестом і чорним.
Середохрестя з самотиною –
світлим хрестом і темним.
Середохрестя з Батьківщиною –
вічним хрестом і буднім.
Середохрестя з собою –
білим хрестом і чорним,
світлим хрестом і темним,
вічним хрестом і буднім.
І знову рятує
Різдво…

184

Дачка чытае
«Нязнайку на Месяцы»,
я – «У Вільні і больш нідзе».
Гаспадар дома
вывучае Горадню…
Загорнутыя ў кніг радно,
мы ў працэсе
прадзіва-дзіва.
За вакном завіруха,
замест мухі
гудзе працэсар…
Толькі ўчора
нарадзіўся Хрыстос,
паглядзеў
на кніг і часопісаў стос
і заснуў…
І пакуль Немаўлятка
ладную
частку дня спіць,
самы час
на Чытанку
Калядную…

Дочка читає
«Незнайка на Місяці»,
я – «У Вільні й більш ніде».
Господар дому
вивчає Гродно…
Закутані в книжкове рядно,
ми в процесі
продива-дива.
За вікном завірюха,
замість мухи
гуде процесор…
Тільки вчора
народився Христос,
оглянув
книжок і часописів стос
і заснув…
І допоки Немовлятко
незрівнянну
частину дня спить,
саме час
на Читанку
Різдвяну…

186

Вялікае Княства Любові
мы ўспомнім у іншай краіне.
Памянем былую сталіцу
і вып'ем за велічнасць мовы.
Той мовы,
з якою кахалі,
той мовы,
што нам засталася
ад Княства
Вялікай
Любові...

Велике Князівство Любові
згадаємо в іншій країні.
Під спомин про давню столицю
за пишну вип’ємо мову.
Ту мову,
з якою кохали,
ту мову,
що нам залишило
Князівство
Любові
Великої…

кахацца ў тумане зімовым
вільготнець у снежным ранку
і светла заплюшчваць вочы
ў чаканні працягу ночы
ў адліжна-ба(на)льных рыфмах
ба(на)льна-жыццёвых рытмах
туманіцца і туманіць
пазногцем выводзіць «…ярам»
і вуснамі – «…даліною»…
і раптам –
«нічога не відна»
ў тумане зімою…

кохатись в тумані зимовому
вологнути в сніжному ранку
і світло заплющувать очі
в чеканні продовження ночі
в відлижно-ба(на)льних римах
ба(на)льно-життєвих ритмах
туманитись і туманити
нігтем виводити «…яром»
вустами затим – «…долинóю»…
і раптом –
«нічого не видно»
в тумані зимою…

На целе,
стомленым ад пяшчоты,
атрымліваюцца
найлепшыя татуяванні,
нябачныя
чужым вачам,
нанесеныя
голкамі тваіх вейкаў…

На тілі,
втомленім від ніжності,
вдаються
найкращі татуювання,
небачені
чужим очам,
зроблені
голками твоїх вій…

Мужчыны адыходзяць,
як Радзіма
ў гісторыю,
дзе Княства і Статуты.
Мужчыны адыходзяць,
а нябыту
няма для іх...
І я сябе гартую,
гартаю акравершы і санеты
і веру ў сны,
што разам мы саснілі.
Мужчыны адыходзяць,
як Радзіма,
бо ведаюць,
што рай яны
згубілі...

Чоловіки відходять,
як Вітчизна
в історію,
де Князівства й Статути.
Чоловіки відходять,
а небуття
немає для них…
І я себе гартую,
гортаю акровірші і сонети
і вірю в сни,
що вкупі ми наснили.
Чоловіки відходять,
як Вітчизна,
бо знають,
що рай вони
згубили…

калі адной шчакою
дакранаешся голак ялінкі
а ля другой шчакі
галінкі веек
значыцца існуе
ігольчатая сіметрыя
значыцца
Каляды сямейныя
калі чакае на падарунак
шкарпэтка святочная
а шкарпэтка з маленькай ножкі
з дзіркаю-зоркаю
ты бярэш голку
працягваеш лінію лёсу
цыруеш калядную зорку
і шапочаш у вялікае вуха
«кахаю»
і «люблю»
у вушка анёлка

коли однією щокою
доторкаєшся до голок ялинки
а коло другої щоки
галузки вій
виходить існує
голчаста симетрія
виходить
Різдво родинне
коли чекає на подарунок
шкарпетка святкова
а шкарпетка з маленької ніжки
з діркою-зіркою
ти береш голку
протягаєш лінію долі
церуєш різдвяну зірку
і шепочеш у велике вухо
«кохаю»
і «люблю»
у вушко ангелика

196

На маніторы грубкі
ніякага спаму.
І толькі няма спакою
аднекуль збоку:
– Мама,
а дыназаўры вымерлі?
– Вымерлі.
– А можа,
яны яшчэ з’явяцца?
– Не з’явяцца.
– Мама,
а калі і беларусы
вымруць?
– Не, не вымруць.
– А калі раптам вымруць,
пра іх таксама
будзе цікава чытаць?
– Цікава.
На маніторы грубкі
ніякага спаму.
Так цёпла,
ажно вусцішна…

На моніторі грубки
ніякого спаму.
І тільки немає спокою
звідкись збоку:
– Мамо,
а динозаври вимерли?
– Вимерли.
– А може,
вони ще з’являться?
– Не з’являться.
– Мамо,
а якщо й білоруси
вимруть?
– Ні, не вимруть.
– А якщо раптом вимруть,
про них так само
буде цікаво читати?
– Цікаво.
На моніторі грубки
ніякого спаму.
Так тепло,
що аж страшно…

А пасля цябе
застанецца Слова,
якое і так было са мною,
якое агучвала тваю прысутнасць
у радках, што беглі
ад тваёй сутнасці
да адсутнасці
на суд вачэй,
у сад начэй,
на крык мой першы,
што Прыпяць чула
і ў свет панесла,
празрыста-светлая –
было трынаццаць гадоў да цэзію…
І крык жыцця той
заўсёды ў Слове
да ўсіх данесеным
і непрамоўленым…

А після тебе
зостанеться Слово,
яке і так було зі мною,
яке озвучувало твою присутність
у рядках, що бігли
од твоєї сутності
до відсутності
на суд очей,
у сад ночей,
на крик мій перший,
що Прип'ять чула
й у світ понесла,
прозористо-світла –
було тринадцять років до цезію…
І крик життя той
завжди у Слові
до всіх донесенім
і непромовленім…

над Лунінцам
Вялікі Воз
над Луцкам
Воз Чумацкі
і той, і той
вязе мой лёс
растрэсвае
на часткі
а як я з воза –
дык лягчэй
таму
хто возіць
шчасце

над Лунинцем
Великий Віз
над Луцьком
Віз Чумацький
і той, і той
талан мій скрізь
розтрушує
по частці
а як я з воза –
легше враз
тому
хто возить
щастя

Змест/Зміст

Літературно-художнє видання

Аксана Вадимівна СПРИНЧАН

кава з українським медом

Поезія

Білоруською та українською мовами

Літературні редактори Петро Коробчук,
Дмитро Щербина
Художній редактор Катерина Черняк
Комп'ютерна верстка Миколи Мартинюка
Коректор Лариса Мартинюк

Дизайн обкладинки Міхаїла Дайлідава
Світлина Яраша Малішевського

Здано до набору 16.10.2017.
Підписано до друку 21.11.2017.
Формат 70х100 1/32. Папір офсетний.
Гарнітура Bookman Old Style.
Ум. друк. арк. 5,40. Обл.-вид. арк. 8,83.
Наклад 500 пр.

Поліграфічно-видавничий дім «Твердиня»
п/с–35, м. Луцьк-5, 43005.
Тел.: +38 (050) 295 02 50
e-mail: tverdyna@gmail.com;
http://tverdyna.ucoz.ua

Свідоцтво Державного комітету
телебачення і радіомовлення України
ДК № 5344 від 16.05.2017 р.

Спринчан А. В.,

С 74 Кава з українським медом : поезія / А. В. Спринчан ; пер. з білорус. Миколи Мартинюка. – Луцьк : ПВД «Твердиня», 2017. – 212 с.

ISBN 978-617-517-277-3

Це перша поетична книга Аксани Спринчан, перекладена мовою її предків по мечу. У відмінному світі, створеному поетесою, поєднуються мріяння і драматична колізія, чуттєвість та інтелектуальність, традиція і експеримент. Асоціативно-філософська поезія авторки для тих, кому кохання не заважає думати, а думання – кохати. Можна навіть перефразувати: передусім для того, кому кохання не заважає перекладати, а переклад – кохати. Миколі Мартинюку якраз вдалося узгодити український світ перекладів з білоруським світом оригіналів.

УДК 821.161.3=161.2
ББК 84.4 БЄА